# ПЛАНЫ СТВАРЭННЯ

## ШОСТАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

МАСКВА. (ТАСС). Акрыленыя велічнымі планамі камуністычнага будаўніцтва, уступілі савецкія людзі ў новую пяцігодку. Праграмай далейшай барацьбы за павышэнне эфектыўнасці народнай гаспадаркі з'явіліся рашэнні Пленума ЦК КПСС, які адбыўся 16 лістапада. Пленум падкрэсліў, што партыйным, савецкім, прафсаюзным і камсамольскім органам, міністэрствам і ведамствам, кіруючыся палажэннямі і вывадамі, выкладзенымі ў прамове таварыша Л. І. Брэжнева на Пленуме, неабходна сканцэнтраваць увагу на паспяховым завяршэнні заданняў бягучага года, выкананні і перавыкананні плана 1982 года і пяцігодкі ў цэлым. У гэтых мэтах накіроўваць усе намаганні на рэалізацыю важнейшай устаноўкі партыі — павышэнне эфектыўнасці народнай гаспадаркі, яе інтэнсіфікацыю. Максімальна выкарыстоўваць наяўныя магчымасці для паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадукцыйнасці працы ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі, павелічэння выпуску і паляпшэння якасці прадукцыі.

З усведамленнем складанасці і адказнасці стаячых перад краінай задач сабраліся дэпутаты ў Вялікім Крамлёўскім Палацы на шостую сесію Вярхоўнага Савета СССР.

17 лістапада ў 11 гадзін раніцы адкрылася сумеснае пасяджэнне Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Бурнымі, працяглымі апладысментамі дэпутаты і госці сустрэлі таварышаў **Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, М. С. Гарбачова, А. А. Грамыку, А. П. Кірыленку, Д. А. Кунаева, А. Я. Пельшэ, Р. В. Раманава, М. А. Суслава, М. А. Ціханава, Д. Ф. Усцінава, К. У. Чарненку, У. В. Шчарбіцкага, Г. А. Аліева, П. Н. Дземічава, Ц. Я. Кісялёва, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, Ш. Р. Рашыдава, М. С. Саломенцава, Э. А. Шэварднадзе, І. В. Капітонава, У. І. Далгіх, М. В. Зімяніна, К. В. Русакова.**

Быў зацверджаны парадак дня сесіі. У яе ўключаны пытанні: аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады; аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1982 год і ходзе выканання Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР у 1981 годзе; аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1982 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту за 1980 год; аб зацвярджэнні ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Вярхоўны Савет СССР заслухаў даклад Намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, Старшыні Дзяржплана СССР дэпутата **Байбакова М. К.** аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады, Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1982 год і аб ходзе выканання Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР у 1981 годзе і даклад Міністра фінансаў СССР дэпутата **Гарбузава В. Ф.** аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1982 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1980 год.

Пазаўчора сесія закончыла работу.

## 25-га ЛІСТАПАДА — АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАЯ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

**У МАТЭРЫЯЛАХ СЁННЯШНЯГА НУМАРА НАШАЙ ГАЗЕТЫ РАСКАЗВАЕЦЦА АБ ДАСЯГНЕННЯХ, З ЯКІМІ ПРЫЙШЛІ ДА ЯЕ КАМСАМОЛЬЦЫ УНІВЕРСІТЭТА**


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 34 (483) | Субота, 21 лістапада 1981 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


# НА ПАРТЫЮ РАЎНЯЮЧЫ КРОК

**У год XXVI з'езда КПСС камітэт камсамола універсітэта трымае справаздачу перад сваімі камсамольцамі.**

**Віталь ТАЛСТАШОЎ,**
**сакратар камітэта ЛКСМБ ГДУ**

Камсамольская арганізацыя універсітэта аб'ядноўвае ў сваіх радах больш чатырох тысяч членаў ВЛКСМ, выступае актыўным памочнікам партыйнага камітэта, прафесарска-выкладчыцкага саставу ў выкананні задач, пастаўленых перад вышэйшай школай, накіроўвае свае намаганні на падрыхтоўку спецыялістаў, якія б мелі шырокую марксісцка-ленінскую і прафесіянальную падрыхтоўку, навыкі практычнай работы, высокую маральную культуру, умелі прымяняць і ажыццяўляць на сучасным узроўні інжынерныя і арганізацыйныя рашэнні.

Камсамольская арганізацыя прымае актыўны ўдзел у ажыццяўленні комплекснага плана камуністычнага выхавання студэнтаў, забяспечвае цеснае адзінства ідэйна-палітычнай, працоўнай і маральнай іх загартоўкі. Галоўным у гэтай рабоце з'яўляецца фарміраванне ў юнакоў і дзяўчат жадання вывучаць марксісцка-ленінскую тэорыю, стварэнне ўмоў для ператварэння ведаў у цвёрдыя камуністычныя перакананні.

Камсамольскія актывісты, выкладчыкі грамадскіх навук дабіваюцца ўсямернага паляпшэння якасці засваення вучэбных дысцыплін. У дапаўненне да вучэбнай праграмы камсамольцы ўключаюць у комплексныя планы ўдзельнікаў Ленінскага заліку вывучэнне работ класікаў марксізму-ленінізму, дакументаў партыі, работ Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева, іншых кіраўнікоў партыі. Ва універсітэце шырока практыкуецца правядзенне навукова-тэарэтычных і практычных канферэнцый, Ленінскіх урокаў, конкурсаў студэнцкіх навуковых работ, грамадска-палітычных чытанняў. Камітэт камсамола, камсамольскія бюро факультэтаў, груп дабіваюцца арганічнага спалучэння глыбокага вывучэння грамадскіх навук з апаратыўным палітычным інфармаваннем. У выніку гэтых намаганняў пастаянна павышаецца паспяховасць студэнтаў па прадметах сацыяльна-эканамічнага цыкла. Узровень яе па выніках апошняй сесіі дасягнуў 99,1 працэнта.

Камітэт камсамола актыўна выкарыстоўвае студэнцкія будаўнічыя і сельскагаспадарчыя атрады для прыцягнення юнакоў і дзяўчат да вырашэння народнагаспадарчых задач, прывіцця навыкаў арганізатарскай, выхаваўчай работы ў працоўных калектывах. Школу працоўнага семестра за апошнія пяць гадоў прайшлі 6.436 студэнтаў універсітэта, тры члены камсамольскай арганізацыі, актыўныя ўдзельнікі і арганізатары студэнцкіх атрадаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. За гэтыя гады патрыятычны рух будатрадаўцаў развіўся ўшырыню: да атрадаў будаўнікоў, меліяратараў далучыліся механізаваныя, ўборачныя атрады, праваднікоў чыгуначных вагонаў і інш. У працоўным семестры 1981 года толькі будаўнічыя атрады асвоілі амаль 900 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Студэнты ГДУ актыўна ўдзельнічалі ў будаўніцтве інтэрната універсітэта ў мікрараёне Валатава.

Аб'ектам асаблівай увагі камсамольскай арганізацыі з'яўляюцца пытанні выхавання студэнцкай моладзі па ленінскіх запаветах, на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа. Камітэт камсамола ў сваёй паўсядзённай рабоце шмат увагі ўдзяляе арганізацыі і правядзенню Ленінскага заліку, грамадска-палітычнай практыкі. Назапашаны вялікі вопыт ваенна-выхаваўчай работы, якая высока ацэнена ў вобласці і ў рэспубліцы.

Важным сродкам павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў з'яўляецца іх шырокі ўдзел у выбарных органах і студэнцкім самакіраванні. 96 працэнтаў юнакоў і дзяўчат маюць пастаянныя камсамольскія даручэнні, у выбарных партыйных, савецкіх, камсамольскіх і прафсаюзных органах працуе амаль палова саставу камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Камсамольская арганізацыя ГДУ падышла да сваёй VII справаздачна-выбарнай канферэнцыі моцнай і згуртаванай, гатовай вырашаць вялікія і адказныя задачы, пастаўленыя перад вышэйшай школай XXVI з'ездам КПСС і XVIII з'ездам ВЛКСМ. Юнакі і дзяўчаты універсітэта поўныя рашучасці новымі поспехамі ў вучобе, навукова-даследчай рабоце, грамадска-палітычнай і працоўнай дзейнасці сустрэць XIX з'езд ВЛКСМ.

## З ЛЕТАПІСУ СЛАЎНЫХ СПРАЎ

У камсамольцаў нашай краіны ёсць выдатная традыцыя — сустракаць знамянальныя даты новымі поспехамі ў вучобе, слаўнымі справамі. У лютым мінулага года адбыўся чарговы XXVI з'езд КПСС. Выдатныя справы савецкай моладзі зліліся ў адзіны калектыўны Рапарт Ленінскага камсамола XXVI з'езду партыі. Вось радкі з Рапарта камсамольцаў ГДУ XXVI з'езду партыі.

☆ ☆ ☆

Камсамольцы геалагічнага факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Даследаванне студэнта Мікалая Вярэмкі на Усесаюзнай студэнцкай навуковай канферэнцыі ў Баку ўдастоена Дыплома І ступені.

У дзесятай пяцігодцы студэнты геафака ўдзельнічалі ў распрацоўцы 11 дзяржбюджэтных і гаспдагаворных тэм.

# НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва паспяховае выкананне вытворчых праграм усё ў большай ступені залежыць ад умення кіраваць працоўнымі працэсамі. Пры падрыхтоўцы маладых спецыялістаў на эканамічным факультэце нашага універсітэта гэтаму пытанню надаецца выключнае значэнне. Найбольш вопытныя выкладчыкі выступаюць з дакладамі па данай тэматыцы ў працоўных калектывах, даюць каштоўныя практычныя рэкамендацыі. Кафедра эканомікі працы правяла вялікую работу і па падрыхтоўцы ўсесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі «Шляхі павышэння эфектыўнасці кіравання працай на прамысловых прадпрыемствах у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС», якая праходзіла гэтымі днямі. Акрамя універсітэта, яе арганізатарамі былі Міністэрства прыборабудавання, сістэм кіравання і сродкаў аўтаматызацыі СССР, «Саюзтэхнапрыбор», СКТБ аналітычнага прыборабудавання, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. На канферэнцыю было прадстаўлена больш 70 дакладаў, тэзісы якіх выйшлі асобным выданнем. У абмеркаванні актуальнага пытання прынялі ўдзел вучоныя з многіх гарадоў краіны, вядучыя спецыялісты планавых органаў, міністэрстваў, ведамстваў, вытворчых аб'яднанняў.

На пленарным пасяджэнні, якое адкрыў дэкан эканамічнага факультэта ГДУ дацэнт І. П. Трацэўскі, з дакладамі выступілі доктары эканамічных навук з Інстытута эканомікі АН БССР Я. А. Гольбін і Р. В. Гаўрылаў з Акадэміі народнай гаспадаркі СССР.

На секцыйных пасяджэннях вялікую цікавасць выклікалі даклады кандыдата эканамічных навук з навукова-даследчага інстытута эканомікі і эканоміка-матэматычных метадаў планавання пры Дзяржплане БССР А. Г. Злотнікава, супрацоўніка Дзяржкампрацы Літоўскай ССР кандыдата эканамічных навук К. Ю. Лукшаса, вучоных-эканамістаў М. Д. Наргізашвілі (г. Тбілісі), В. І. Кулікова (г. Іванава), С. Н. Сямёнава (г. Уфа). Многія ўдзельнікі канферэнцыі выступалі з навуковымі паведамленнямі.

Укараненне навуковых рэкамендацый у практыку дазволіць яшчэ больш эфектыўна ажыццяўляць кіраўніцтва працай на прамысловых прадпрыемствах краіны.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

# СТУДЭНТ ПРЫСЯГАЕ ТАБЕ, КАМСАМОЛ!

НАША краіна адсвяткавала 64-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка. Напярэдадні гэтага свята калектывы прадпрыемстваў, будоўляў, гаспадарак рапартавалі партыі аб поспехах і дасягненнях, з якімі яны сустракалі слаўную гадавіну.

Менавіта ў гэтыя дні ў нашым універсітэце падводзяцца і вынікі ваенна-патрыятычнай работы. Шмат чаго было зроблена за прайшоўшы год па дасягненню пастаўленай мэты: расла палітычная свядомасць студэнтаў, выхоўвалася ідэйная перакананасць, савецкі патрыятызм, пастаянная гатоўнасць стаць на абарону сваёй сацыялістычнай Айчыны, заваёў сацыялізму, многа ўвагі ўдзялялася фізічнай загартоўцы моладзі.

## ВЫХОЎВАЕМ ПАТРЫЁТАЎ

У нашым універсітэце склаўся шэраг эфектыўных форм і метадаў абаронна-масавай і ваенна-патрыятычнай дзейнасці. Гэта сустрэчы і вечары з удзелам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, паход па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Гомельшчыны, работа па вывучэнню і ахове помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

Кожны год ва універсітэцкім парку праводзяцца мітынгі, ўскладваюцца вянкі і кветкі, ушаноўваецца памяць загінуўшых воінаў. Не стаў выключэннем і мінулы навучальны год. 26 лістапада 1980 года тут сабраліся студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі, каб ушанаваць памяць воінаў, якія вызвалялі наш горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Напэўна, надоўга засталіся ў памяці юнакоў і дзяўчат словы ветэрана вайны, выкладчыка кафедры грамадзянскай абароны А. А. Баскакава аб цяжкасцях, якія леглі на плечы ўсяго савецкага народа ў гады фашысцкага ліхалецця.

Памятны і цёплы майскі дзень 8 мая, калі ля брацкай магілы ў парку сабралася шмат народу. Святочнае адчуванне Дня Перамогі ахапіла тады ўсіх. Мінутай маўчання ўшанавалі памяць загінуўшых. Менавіта адсюль, са студэнцкага парка, з цэрымоніі ўскладання кветак пачынаўся і Зорны паход. Такія паходы сталі ва універсітэце традыцыйнымі і праводзяцца ў час месячнікаў абаронна-масавай работы. У гэтым годзе паход па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Гомельшчыны быў арганізаваны ў гонар XXVI з'езда КПСС і Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. 23 лютага група студэнтаў, у склад якой увайшлі прадстаўнікі ўсіх факультэтаў на чале з актывістамі ДТСААФ старшымі выкладчыкамі П. П. Саковічам, Ф. М. Семяненкам, Ю. В. Жураўлёвым, А. М. Аляксеевым і іншымі, на працягу шасці дзён па трох маршрутах Рэчыцкага, Хойніцкага, Калінкавіцкага, Лельчыцкага і Мазырскага раёнаў прайшла па гарадах і вёсках, сустрэлася з моладдзю ў калгасах і саўгасах, у школах, наведала памятныя мясціны былых баёў, правяла шэраг сумесных урачыстых мерапрыемстваў і сустрэч з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, паважанымі людзьмі калгасаў і саўгасаў. Былі наладжаны гутаркі на палітычныя і ваенна-патрыятычныя тэмы. Агітатары расказалі і пра наш універсітэт. У паходзе прынялі ўдзел самадзейныя артысты, якія далі шмат канцэртаў, арганізоўвалі вечары адпачынку.

Яшчэ адным з мерапрыемстваў месячніка абаронна-масавай работы быў калектыўны прагляд і абмеркаванне кінастужкі «Асабліва важнае заданне». Гэты фільм прагледзелі амаль усе студэнты універсітэта. На абмеркаванне яго запрашаліся ветэраны вайны А. А. Баскакаў, А. С. Калугін, В. А. Дуброўскі, іншыя выкладчыкі.

Нельга не сказаць аб мерапрыемстве, якое стала ва універсітэце не проста традыцыйным, а і любімым. Гэта аднадзённы турыстычны паход студэнтаў першага курса. У гэтым годзе ён адбыўся 17 мая і праходзіў па двух маршрутах: Гомель — Клёнкі — Гомель і Гомель — Чонкі — Гомель. Разам са студэнтамі ў паходзе былі ветэраны вайны В. А. Дуброўскі і У. В. Анічэнка. Сэрца кожнага крануў іх расказ аб геранчным подзвігу савецкага салдата ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Хочацца адзначыць ваенна-патрыятычную работу на фізічным, гісторыка-філалагічным, эканамічным і біялагічным факультэтах. Шмат цікавых мерапрыемстваў было праведзена тут. Запомнілася, напэўна, студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта сустрэча з Марыяй Мікалаеўнай Сіманян-Крыленка, дачкой віднага рэвалюцыянера, выдатнага дзяржаўнага дзеяча і вучонага Мікалая Крыленкі. Падзеяй стала на біялагічным факультэце гутарка «Шлях у вайне», у якой прыняў удзел ветэран вайны М. В. Шалухін.

Немалая роля ў добрай пастаноўцы работы на гэтых факультэтах належыць адказным за ваенна-патрыятычнае выхаванне: Міхаілу Сяргеенка, Анатолю Шэвелю, Алегу Рымашэўскаму, Аляксандру Скурлову.

А вось на матэматычным факультэце работа гэтая пакідае жадаць лепшага. Нават агульнауніверсітэцкія мерапрыемствы тут не карыстаюцца належнай увагай.

Плён ваенна-патрыятычнай работы для выхавання моладзі відавочны. У аглядзе-конкурсе ваенна-патрыятычнага выхавання і абаронна-масавай работы наш універсітэт апошнія чатыры гады трывала ўтрымлівае першынство сярод ВНУ вобласці.

**Наталля КАНДРАТАВА,**
**адказная за работу ваенна-патрыятычнага сектара камітэта камсамола.**

*Расказваем пра дэлегатаў*

# КАМСАМОЛЬСКІ ВАЖАК

Высокую, танклявую постаць Васіля Кароткага часта можна ўбачыць у калідоры эканамічнага факультэта. То ён размаўляе з кім-небудзь са сваіх таварышаў студэнтаў-эканамістаў, а то з выкладчыкамі, работнікамі з камітэта камсамола. Іншы раз цікавая думка прыходзіць на хаду, і падзяліцца ёю хочацца адразу з кім-небудзь з сяброў, старэйшых таварышаў. Ажыўленне на тварах субяседнікаў сведчыць аб важнасці абмяркоўваемага. Гавораць аб многім і розным. Яно і не дзіўна: Васіль за чатыры гады вучобы ва універсітэце быў завадатарам і ўдзельнікам многіх спраў. Актыўнага хлопца, здольнага арганізатара прыкмецілі яшчэ, бадай, на падрыхтоўчым аддзяленні. І ўжо тады выбралі сакратаром камсамольскага бюро аддзялення. На першым курсе эканамічнага факультэта ён становіцца сакратаром камсамольскага бюро курса. Яго рост як камсамольскага важака працягваўся на другім і трэцім курсах, калі ён быў намеснікам сакратара камітэта камсамола факультэта па арганізацыйнай рабоце. За ўсім гэтым стаяла вялікая работа, жаданне быць карысным. Гэта бачылі і цанілі яго таварышы.



На эканамічным факультэце атрымаў шырокі размах будатрадаўскі рух. Васіль імкнуўся як мага больш разнастаіць яго формы. Менавіта таму, магчыма, яму даручылі арганізацыйную работу камітэта камсамола. І Васіль не толькі клапоціцца аб падрыхтоўцы атрадаў да працоўнага семестра, але ён сам кожны год працуе ў іх. На другім курсе, напрыклад, ён быў камандзірам зводнага абласнога атрада імя 60-годдзя ВЛКСМ бескарыснай працы. Атрад працаваў на аб'ектах меліярацыі. І, як заўсёды, вёў вялікую грамадскую, шэфскую работу. У вёсцы, дзе працаваў атрад, застаўся помнік на магіле воінаў Вялікай Айчыннай вайны, які рабяты зрабілі па ўласнаму праекту. Мінулым летам у вёсцы Нісімкавічы будаўнічы атрад «Палессе» узводзіў зернесховішча. Васіль быў камісарам гэтага атрада.

У кола арганізацыйнай работы ўваходзяць, акрамя будатрадаўскага руху, яшчэ і кіраўніцтва добраахвотнай народнай дружынай, сектарам уліку, жыллёва-бытавым сектарам. Таму на працягу ўсяго вучэбнага года напружанне ў дзейнасці камсамольскага важака не спадае. Штаб працоўных спраў ажыццяўляе арганізацыю суботнікаў на «Гомсельмашы», дапамагае ветэранам вайны і сем'ям загінуўшых. Ужо ў снежні пачынаецца фарміраванне будаўнічых атрадаў. У сёлетнім годзе на эканомфаку іх будзе сфарміравана 14. У гэтай рабоце шмат ёсць нюансаў. Будучыя байцы атрада павінны прайсці ўсебаковую праверку на сталасць, адпаведную падрыхтоўку да працы, азнаямленне са спецыяльнасцю, па якой прыдзецца працаваць улетку.

Шмат работы і ў добраахвотнай дружыне. Яе нармальная і пастаянная дзейнасць залежыць ад дакладнага захавання графіка. Акрамя рэгулярных дзяжурстваў, дружыннікі наладжваюць рэйды па тэрыторыі, якая прылягае да універсітэта. Былі выпадкі, калі рабяты затрымлівалі хуліганаў, наводзілі парадак у грамадскіх месцах. Гэта ўдавалася таму, што на вуліцу з чырвонымі павязкамі дружыннікаў выходзяць не проста юнакі, студэнты, а падрыхтаваныя людзі: ва універсітэце працуе секцыя для дружыннікаў, дзе добраахвотнікі атрымліваюць спецыяльныя веды, фізічную загартоўку.

Работа жыллёва-бытавога сектара, па словах Васіля Кароткага, — асаблівы клопат камсамольцаў. Зрабіць усё магчымае, каб вучоба ва універсітэце стала не толькі часам прафесіянальнай падрыхтоўкі, але і часам фарміравання ў кожнага студэнта савецкай грамадзянскасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі, каб час гэты быў памятны сустрэчамі і знаёмствамі з лепшымі людзьмі нашага горада, вобласці. Ды і сам быт, каб быў наладжаным, каб прыкметай студэнцкага дома — інтэрната — была ўтульнасць.

— Менавіта таму сочым за чысцінёй і парадкам, — гаворыць Васіль, — запрашаем да сябе на гутаркі мадэльераў, цырульнікаў, шмат увагі ўдзяляем нагляднай агітацыі — змястоўнай, маляўнічай, зробленай з густам.

Тут памочнікі Васіля — студэнцкія саветы і старасты паверхаў. Часта па вечарах у адным з пакояў збіраюцца яны ўсе разам, каб абмеркаваць наспеўшыя справы.

Як раз у час, калі пісаўся гэты матэрыял, я стала сведкай адной размовы. Паміж сабой гаварылі студэнты эканамічнага факультэта. Мяне закранула адна фраза: «І, як заўсёды, душой усяго гэтага быў Вася Кароткі...» Дык вось што яшчэ неабходна важаку моладзі, акрамя дзелавітасці, арганізатарскіх здольнасцей, — быць душой! Толькі ў такім выпадку за табой прызнаюць права першынства, права быць важаком.

**М. ШЫМАНОЎСКАЯ.**

# ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК

Вялікі ўклад у ахову грамадскага парадку на тэрыторыі Цэнтральнага раёна нашага горада ўносіць атрад дружыннікаў універсітэта. Агульная колькасць членаў ДНД складае больш 900 чалавек. Наша дружына з'яўляецца самай масавай у раёне ды, бадай, і ў горадзе. Адсюль выцякаюць павышаныя патрабаванні да яе работы. Аб тым, што патрабаванні менавіта павышаныя, сведчыць той факт, што па выніках мінулага 1980 года добраахвотная дружына універсітэта была ўзнагароджана Ганаровай граматай Цэнтральнага РК КПБ.

Асабліваe месца ў рабоце дружыны займае дзяжурства на апорных пунктах аховы правапарадку №№ 1 і 3. За мінулы год на дзяжурства кожны раз выходзіла не менш 50 чалавек. Найлепшым чынам арганізуюцца дзяжурствы на фізічным факультэце (камандзір А. Кручко), на эканамічным (камандзір А. Плешкуноў), на гісторыка-філалагічным (камандзір І. Гардзіевіч).

Адным з галоўных напрамкаў у рабоце ДНД з'яўляецца актыўнае супрацоўніцтва з органамі ўнутраных спраў. З кожным годам яно пашыраецца, набывае ўсё новыя формы і рысы. Нашы студэнты працуюць пазаштатнымі супрацоўнікамі аддзела барацьбы з раскраданнем сацыялістычнай маёмасці, крымінальнага вышуку, дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі, пазаштатнымі ўчастковымі інспектарамі, удзельнічаюць у прафілактыцы правапарушэнняў.

Вялікай увагі заслугоўвае работа спецыялізаванай дружыны па рабоце з падлеткамі, якая створана пры апорным пункце грамадскага парадку № 3. Работай нашых студэнтаў тут кіруе капітан міліцыі, участковы інспектар Р. Ю. Кур'янчык. Актыўнымі яго памочнікамі ў гэтай справе з'яўляюцца студэнты Л. Міхеева, Л. Кажэўнікава, Т. Жаўранкава.

Высокая свядомасць, добрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў характэрныя для ўсіх членаў добраахвотнай народнай дружыны, ім уласціва разуменне пачэснага абавязку — заўсёды быць на ахове грамадскага правапарадку.

**В. ВАСІЛЕЦ,**
**член камітэта камсамола універсітэта, камандзір ДНД.**

## З ЛЕТАПІСУ СЛАЎНЫХ СПРАЎ

З новымі дасягненнямі сустрэў у лістападзе 1980 года свой 10-гадовы юбілей эканамічны факультэт. Упершыню ў мінулым годзе быў сфарміраваны зводны абласны камуністычны атрад імя 60-годдзя Ленінскага камсамола, які ўзначаліў Васіль Кароткі. Па выніках трэцяга працоўнага семестра-80 атрад прызнаны лепшым СБА ў вобласці.

☆ • ☆

Высокімі спартыўнымі дасягненнямі сустрэла XXVI з'езд КПСС камсамольская арганізацыя факультэта фізвыхавання. Ганаровае права ўдзельнічаць у Алімпіядзе-80 было прадастаўлена вядомым спартсменам ГДУ А. Фомчанку, М. Кіраву, А. Вараб'ю. М. Кіраў заваяваў бронзавы медаль у бегу на 800 м, вясляр А. Фомчанка заняў 5-е месца.

☆ • ☆

На гісторыка-філалагічным факультэце ганаровае права падпісаць Рапарт XXVI з'езду КПСС было прадастаўлена 26 лепшым студэнтам, пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва. Сярод іх — купалаўская стыпендыятка Алена Сулейка, выдатніцы вучобы Людміла Кніга, Алена Гайдукова і інш. Добрай і выдатнай вучобай быў азнаменаваны год падрыхтоўкі да вышэйшага форуму партыі. Паспяховасць на факультэце склала 99,3 працэнта.

